сельска-гаспадарчага падатку, мы нарушылі развахунковы балянс між горадам і вёскаю на карысьць апошняй". Тав. Праабражэнскі разглядае, як нарушэньне правільнай лініі партыі, як эканамічную памылку, зьмяншэньне сельска-гаспадарчага падатку ў 1925-26 г. Той жа пункт гледжаньня (вы гэта ведаеце з выступленьня тав. Рыкава) выказваў і тав. Вінаградаў у сваім артыкуле, які казаў, што пры росьце сялянскае гаспадаркі неабходна сельска-гасп. падатак значна павялічыць. Тая ж лінія выказваецца ў пастаноўцы пытаньня ў тав. Праабражэнскага ў яго прапановах аб палітыцы цэн (гл. «Большевик»), на чым я спынюся некалькі ніжэй. Партыя ў гэтым пытаньні сацыялістычнага навапашваньня за кошт выцягненьня часткі прыбыткаў сялянскае гаспадаркі трымаецца ранейшае лініі; яшчэ не вядома ці можна ў 1926-27 г. павялічыць сельска-гаспадарчы падатак больш, як да 300.000.000 (ён быў, прыблізна, роўны 240.000.000 р.).

Відавочна, у пытаньні сельска-гаспадарчае падатковае палітыкі было-б няверна выходзіць толькі з пункту гледжаньня фінансавага становішча прамысловасьці. Зразумела, фінансавае становішча прамысловасьці гэта само сабою. Але ў той жа час неабходна памятаць моцную сувязь прамысловасьці з сялянскаю гаспадаркаю аб палітычным саюзе рабочае клясы і сялянства, аб небясьпецы паўтарэньня крызісу 1923-24 г., у адносінах прамысловасьці і сельскае гаспадаркі.

Трэцяя крыніца навапашваньня—гэта эканомія, ашчаднасьць, скарачэньне непрадукцыйных выдаткаў. Гэткім парадкам мы можам дзесяткі і, магчыма, сотні міліёнаў зьберагчы.

Па гэтай лініі партыя і рабочая кляса зараз разгортваюць вялізарную працу і, зусім ясна, што бюджэт новага году мы павінны таксама будаваць, выходзячы з гэтага пункту гледжаньня. Мы павінны берагчы кожны грош для таго, каб укласьці ў нашу прамысловасьць і, выходзячы з гэтага пункту гледжаньня, будаваць бюджэт.

І чацьвертая форма навапашаньвя —гэта ўцягненьне прыватных навапашваньяў у русло сацыялістычнага навапашваньня. Гэта ідзе па лініі ўцягненьня сродкаў у сельска-гаспадарчую, крэдытную кааперацыю, у спажывецкую кааперацыю, у пазыкі, у касы ашчаднасьці. Тут, трэба сказаць, у нас справа ідзе яшчэ вельмі марудна. Я ня ведаю, наколькі гэта так, але вось, прыкладам, наконт спажывецкае кааперацыі мне тав. Наўлянскі апавядаў. Выходзіць, што ў шэрагу выпадкаў у спажывецкую кааперацыю ўклады прыцякаюць лепш, чым у сельска-гаспадарчую. Дзеля чаго гэта выходзіць?—Дзеля таго, што спажывецкая кааперацыя ўжо больш дужая, карыстаецца вялікім гаспадарчым аўтарытэтам у вёсцы, і сяляне больш давяраюць ёй і з большаю ахвотаю нясуць у спажывецкую кааперацыю свае ўклады. Праўда, спажывецкая кааперацыя павінна адмаўляцца ад гэтых укладаў,—згодна статуту яна ня можа займацца ўкладнымі апэрацыямі. Характэрна якраз тая сыстэма, якая заваявала большы гаспадарчы аўтарытэт, якраз яна пачынае прыцягваць гэтыя ўклады з сялянскае гаспадаркі.

Адсюль ясна, што асноўным шляхам уцягненьня ўкладаў у сельска-гаспадарчую і крэдытную кааперацыю зьяўляецца агульнае ўмацаваньне яе працы, заваёва для яе аўтарытэту ў вёсцы, праўдзеньне на справе выбарнасьці, канчатковае вынішчэньне выпадкаў злачынства. У гэтых адносінах перад партыяй стаіць вялікая праца.

У касы ашчаднасьці таксама ўцягненьне ўкладаў адстае,—у іх па ўсім Саюзе ў канцы 1925 году было 12 міліёнаў рублёў, у той час, як да вайны ў касах ашчаднасьці было каля двух міліярдаў рублёў. Зусім відавочна, што ў сялянскай гаспадарцы ёсьць шмат зьберажэньняў, у горадзе ў прыватнага жыхарства ёсьць таксама такія-сякія зьберажэньні. І дзеля гэтага гэту працу трэба разьвіваць надзвычайна настойна, асабліва ў вёсцы.

Належыць паставіць, апроч таго, на вывучэньне і праверку пытаньне аб уцягненьні прыватнага капіталу ў вытворчасьць, на вытворчыя мэты, на больш мэтазгоднае ўжываньне прыватнага капіталу—паколькі гэта ўкладка прыватнага капіталу магла-б дапамагчы зьнябыць таварны голад, адцягвала-б прыватны капітал з галіны гандлю, дзе чыннасьць прыватнага капіталу моцна дэзарганізуе чыннасьць і ўкліньваецца між прамысловасьцю і сялянскім рынкам.

(Менскі і Бабруйскі АК ужо маюць першую практыку ў справе ўцягненьня прыватных навапашваньняў у вытворчасьць праз паявыя таварыствы, у форме прапаноў стварыць акцыянэрнае таварыства наўкола фабрыкі мэблі).

(*Працяг у заўтрашнім нумары*).

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы